МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
**МАГІЛЁЎСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

вул. Першамайская, 28а
212030 г. Магілёў

тэл. (0222) 42 20 33, тэл. (0222) 42 24 67
E-mail: mgec@mogilev.by; сайт: www.mogilev.gov.by

р/р BY95 AKBB 3604 0174 4059 1700 0000
МАУ № 700 ААТ ААБ «Беларусбанк»,
код AKBBBY2X, УНП 700123787

МОГИЛЕВСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

ул. Первомайская, 28а
212030 г. Могилев

тел. (0222) 42 20 33, тел. (0222) 42 24 67
E-mail: mgec@mogilev.by; сайт: www.mogilev.gov.by

р/с BY95 AKBB 3604 0174 4059 1700 0000
МОУ № 700 ОАО АСБ «Беларусбанк»,
код AKBBBY2X, УНП 700123787

20.08.2021 № К01-1542

на № ____________ ад ______________

(Просьба паведаміць іншым заяўнікам)

e-mail:

Магілёўскі гарадскі выканаўчы камітэт (далей - гарвыканкам), разгледзеўшы Ваш зварот па пытанні зносу гістарычнага будынку, які размешчаны па адрасу: г.Магілёў, вул.Ленінская, 50А, паведамляе наступнае.

Будынак шматкватэрнага жылога дому па вул.Ленінскай, 50А не з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і не ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.05.2007 г. № 578.

Згодна інфармацыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі будынак па вул.Ленінскай, 50А быў пабудаваны ў 1890-х гг. у якасці даходнага дому (прызначаўся для здачы кватэр ў арэнду), іншых канкрэтных звестак аб якіх-небудзь важных гістарычных падзеях ці гістарычных асобах, якія тым ці іншым спосабам былі звязаны з гісторыяй гэтага будынка не маецца.

Праектная дакументацыя па аб'екце будзе распрацавана з захаваннем патрабаванняў дзеючага заканадаўства ў галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай, будаўнічай дзейнасці, супрацьпажарных і санітарных нормаў, праектна-каштарысная дакументацыя па аб'екце падлягае абавязковай дзяржаўнай экспертызе.

Вашы прапановы будуць улічаны пры падвядзенні вынікаў грамадскага абмеркавання па аб'екце "Многофункциональное здание бизнес-центра по ул. Ленинской, 50А в г. Могилёве, со сносом двухэтажного жилого дома, гаражей и благоустройством территории". Вынікі грамадскага абмеркавання будуць размешчаны на афіцыйным сайце Магілёўскага гарвыканкама.

У адпаведнасці з пунктам 1 артыкулу 20 Закона Рэспублікі Беларусь

УПКП «МОУТ», з. 2277, т. 5000

«Об обращениях граждан и юридических лиц» ад 18 ліпеня 2011 г. Вы маеце права абскардзіць сапраўдны адказ у Магілёўскім абласным выканаўчым камітэце (212030, г.Магілёў, вул.Першамайская , 71).

Намеснік старшыні
Магілёўскага гарвыканкама А.С.Кіблоў

Бабкуноў 42 30 41